Источник: "Звязда" - 2014-03-19

Даты | Падзеі | Людзі



**1813** год — нарадзіўся Дэвід Лівінгстан, шатландскі даследчык Афрыкі. Да пачатку XIX стагоддзя еўрапейцам мала што было вядома пра гэты кантынент. На карту было нанесена толькі вузкае ўзбярэжжа ўздоўж Атлантычнага і Індыйскага акіянаў, а таксама Міжземнага мора. Сітуацыя прынцыпова змянілася пасля даследаванняў шатландца Дэвіда Лівінгстана. Ён першы перасёк Паўднёвую Афрыку ад Атлантычнага акіяна да Індыйскага. З поўдня на поўнач прайшоў Калахары, адкрыў вадаспад Вікторыя. Пры гэтым вучоны вёў пастаянную барацьбу з гандлярамі рабамі, уступаючы ў канфлікты з партугальцамі і бурамі. У 1857 годзе Лівінгстан выдаў першую кнігу пра свае падарожжы, якая мела велізарны поспех. Сёння імя даследчыка, які прысвяціў Афрыцы 30 гадоў жыцця, носяць гарады, геаграфічныя аб'екты і нават мінерал.

**1889** год — 125 гадоў таму нарадзіўся (в. Дакудава, цяпер Крупскі раён) Васіль Андрэевіч Самцэвіч, вядомы беларускі педагог і краязнавец, заслужаны настаўнік БССР. Скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут (1915) і Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут (1935). Працаваў на Лагойшчыне, а з 1923 года і да выхаду на пенсію ў 1957 г. — у Барысаве на розных пасадах у сферы адукацыі (1928—1933 гг. — у Акадэміі навук БССР). Аўтар каля 300 навуковых, метадычных, вучэбных, краязнаўчых і іншых прац, у тым ліку шэрагу падручнікаў і дапаможнікаў па беларускай мове для вучняў 1—7 класаў (1950—1964), «Методыкі беларускай мовы ў пачатковай школе» (1955). Асаблівую ўвагу надаваў павышэнню эфектыўнасці выкладання моў у школе. Удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Узнагароджаны ордэнам «Знак пашаны», медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, некалькі разоў выбіраўся дэпутатам Барысаўскага гарсавета. Памёр у 1973 годзе.

**1944** год — 70 гадоў таму савецкія войскі вызвалілі вязняў Азарыцкага і іншых канцлагераў смерці на Гомельшчыне. Нямецка-фашысцкія захопнікі ў пачатку сакавіка 1944 г. стварылі тры лагеры смерці ў былым Даманавіцкім раёне, недалёка ад пярэдняга краю абароны каля г.п. Азарычы, вёсак Дзерць і Падасіннік. Пад выглядам эвакуацыі сюды было дастаўлена больш за 50 тыс. непрацаздольных грамадзян. Сярод вязняў гітлераўцы змясцілі хворых сыпным тыфам з мэтай распаўсюдзіць эпідэмію на надыходзячыя часці Чырвонай Арміі. Для ўзмацнення эпідэміі тыфозных хворых пераводзілі з аднаго лагера ў іншы. Вязні знаходзіліся на адкрытых багністых участках (у лагерах не было пабудоў), абнесеныя калючым дротам, з кулямётнымі вышкамі і міннымі палямі вакол іх. Зняволеных марылі голадам, змушалі піць балотную ваду, ім забаранялі паліць вогнішчы. Любая форма пратэсту каралася масавымі расстрэламі. І калі чырвонаармейцы адкрылі вароты лагера, то сустрэлі сваіх збаўцаў толькі 33480 чалавек. За час існавання Азарыцкіх лагераў смерці загінула больш за 9 тысяч чалавек, сотні людзей былі закатаваныя на шляху ў лагеры, памерлі ад знясілення і хвароб у першыя дні пасля вызвалення. У 1964 г. на месцы лагера ў вёсцы Дзерць устаноўлены помнік, у 1965-м каля г.п. Азарычы быў створаны мемарыяльны комплекс.

## Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, празаік, драматург, публіцыст:**

*«Свет не толькі бязлітасны і жорсткі. Ён яшчэ ласкавы і ясны».*